3КП
Г-18

Гамарнік

# Справаздача

# ЦК КП(б)Б на XII-ым зъезьдзе Комуністычнай партыі (б) Беларусі

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Менск 1929 г.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ҺКП2
Г 18

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Гамарнік.

# СПРАВАЗДАЧА

## ЦК КП(б)Б НА XII-ым ЗЬЕЗЬДЗЕ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (б) БЕЛАРУСІ

(ДАКЛАД тав. ГАМАРНІКА)

6 лютага 1929 г.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
1954 г.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК 1929

Біб СНК

Надрукавана ў друкарні
Беларускага
Дзяржаўнага
-Выдавецтва-

Заказ № 168. 3.000 экз. Галоўлітбел № 873.

ПРЭЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Таварышы, XII зьезду партыі неабходна падагуліць вынікі праробленае ад XI зьезду ЦК і ўсёй партыяй работы па рэалізацыі пастаноў XV зьезду ЎсеКП(б) і XI зьезду КП(б)Б і вызначыць далейшыя асноўныя задачы. Прычым, падагульняючы вынікі працы за мінулы пэрыод, неабходна адважнай рашучай самакрытыкай выкрыць усе недахопы, памылкі і паказаць адначасна посьпехі, узоры новай комуністычнай работы.

Ацэнку работы за мінулы пэрыод мы павінны даць у сьвятле якасьці і ступені вырашэньня намі наступных асноўных задач, вызначаных дырэктывамі XV зьезду ЎсеКП(б), XI КП(б)Б і наступнымі пастановамі партыі:

1. Праводзіць шпаркім, напружаным тэмпам індустрыялізацыю краіны.

2. Прыняць усе меры да рашучага ўзмацненьня тэмпу ўздыму сельскае гаспадаркі, соцыялістычнае рэконструкцыі яе, маючы на ўвазе ў якасьці

галоўнага вырашальнага шляху, шлях колектывізацыі, саўгаснага будаўніцтва і вытворчага копэраваньня, а таксама ўсямернае стымуляваньне росту індывідуальнае бядняцка-серадняцкае гаспадаркі.

3. Весьці рашучае наступленьне на прыватнаўласьніцкія элемэнты гораду і вёскі.

4. Падымаць матэрыяльны ўзровень жыцьця рабочае клясы і працоўнага сялянства.

5. Магутным тэмпам разгортваць культурную рэволюцыю.

6. Выразна праводзіць ленінскую нацыянальную політыку, змагаючыся проці ўсякага шовінізму, проці розных ухілаў.

7. Берагчы, як вока, адзінства партыі, ленінскую лінію яе, бязьлітасна змагаючыся на два фронты з ухіламі ад яе і прымірэнцтвам.

8. Самакрытыку зрабіць сыстэмай усяе работы.

Дазьвольце мне перайсьці да ацэнкі вынікаў у асьвятленьні рэалізацыі партыяй вышэйпералічаных асноўных задач і вызначыць асноўныя галіны нашае далейшае работы.

## І. РАЗЬВІЦЬЦЁ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ.

Я пачну з аналізу разьвіцьця народнае гаспадаркі Беларусі за мінулы пэрыод. Асноўныя па-

казьнікі для характарыстыкі разьвіцьця гаспадаркі ў цэлым наступныя:

| | У проц. да папярэдняга году | |
|---|---|---|
| | да 26—27 г. 25—26 г. | да 27—28 г. 26—27 г. |
| а) Засеўная плошча . „ . . . | 103,8 | 102,6 |
| б) Агульная продукцыя земляробства (па цэнах 26—27 г. . . . . | 97,6 | 106,6 |
| в) Агульная продукцыя прамыслов. . | 113,7 | 120,9 |
| г) Чыгуначны грузазварот. . . . | 110,6 | 107,9 |
| д) Агульныя размеры гандлёвага звароту . . . . . . . | 104,3 | 119,3 |
| е) Экспорт. . . . . . . | 151,3 | 157,9 |
| ж) Бюджэт мясцовы і дзяржаўны . | 116 | 127 |

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Гэтыя лічбы гаворыць аб значным росьце ўсяе народнае гаспадаркі ў цэлым у 27—28 г. аб большым тэмпе росту прамысловасьці і аб росьце сельскае гаспадаркі, але тэмпам невыстарчальным.

### Прамысловасьць.

Мы маем няўхільны рост адноснае вагі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР і павышэньне ролі буйнае прамысловасьці. Вось асноўныя паказьнікі гэтага:

| | У процантах | | |
|---|---|---|---|
| | 25–26 г. | 26–27 г. | 27–28 г. |
| 1) Агульная продукцыя ўсяе прамысловасьці да ўсяе народн. гаспад. продукцыі | 19,4 | 21,1 | 23,3 |
| 2) Па буйнай прамысловасьці | 11,8 | 13,1 | 16,9 |
| 3) Таварная маса ўсяе прамысл. да ўсае народн. масы народнае гаспадаркі . . | 65,9 | 69,1 | 71,9 |

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Таксама я зварочваю вашу ўвагу на вялізны рост асноўных фондаў прамысловасьці. Вось лічбы ў проц. да папярэдняга году:

| | 25–26 г. | 26–27 г. | 27–28 г. |
|---|---|---|---|
| Па прамысловасьці . . | 7,6 | 14,1 | 30,3 |
| Асобна па буйнай . . | 12,5 | 21,2 | 39,2 |

Такім чынам, лінія партыі на ўсямернае павышэньне адноснае вагі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы Беларусі праводзілася выразна і дала значныя посьпехі. Мінулы год даў зьніжэньне сабекошту продукцыі на 5 проц. проці 3,8 проц. у 26-27 г.

У адносінах зарплаты і продукцыйнасьці працы мы маем за мінулы год наступныя суадносіны:

| | 27—28 г. у % да 26—27 г. | 26—27 г. у % да 25—26 г. |
|---|---|---|
| Дзенная выпрацоўка 1 раб. | 116,3 | 106,6 |
| Дзенная номін. зарплата . | 115 | 113,4 |

г. зн. значнае палепшаньне ў бок росту продукцыйнасьці працы ў параўнаньні з 26-27 г. Але, зразумела, гэтыя якасныя паказьнікі яўна невыстарчальныя. Мы маем на нашых фабрыках і заводах яшчэ вельмі шмат недахопаў, а іншы раз і агіднасьцяй, фактаў злачынных адносін да пролетарскае справы з боку некаторых асоб і адсталых груп рабочых—адсутнасьць працоўнае дысцыпліны, дрэнныя адносіны да вытворчасьці, п'янства, прагулы, хуліганства ды інш. Мы маем шмат фактаў бюрократычных, чыноўніцкіх адносін да вытворчасьці і да рабочых з боку адміністрацыі і часамі з боку заўкому і ком'ячэйкі. У 1928 годзе прагулы склалі каля 10 проц. усяго рабочага часу, што складае толькі па прамысловасьці ВСНГ Беларусі штодзенны нявыхад на работу 2.700 чалавек.

## Вывады і задачы ў галіне прамысловасьці.

Магутным тэмпам мы пасоўваем наперад прамысловасьць Беларусі, павялічылі яе адносную вагу ў народнай гаспадарцы ў цэлым, дамагліся некаторых посьпехаў у якасьці работы, павялічваем капітальныя ўклады, але яшчэ аграмадны лік недахопаў у нашым капітальным будаўніцтве, у пляnаваньні, вельмі нізкія яшчэ якасныя паказьнікі. Наша задача ў Беларусі, усімі мерамі ўсімі сіламі разьвіваць прамысловасьць, усямерна павышаючы ўсё далей яе адносную вагу, павялічваючы ролю буйнае прамысловасьці. Адначасна падтрымліваючы разквіцьцё саматужна-прамысловай коопэрацыі. Па контрольных лічбах на 28-29 год вызначаецца:

а) рост продукцыі прамысловасьці на 37 проц., па рэспубліканскай мяркуецца на 36,7 проц.;

б) рост выпрацоўкі на аднаго рабочага вызначаецца на 17,7 проц. і рост зарплаты па прамысловасьці ВСНГ на 8 проц.;

в) зьніжэньне сабекошту на 70 проц.;

г) адносная вага прамысловасьці вызначаецца— на 31,4 проц. проці 25,7 проц. мінулага году;

д) капітальнае будаўніцтва па ўсёй дзяржаўнай цэнзавай прамысловасьці вызначаецца ў 36,7 мн. р. проці 20 мільёнаў—мінулага году;

і) па пяцігодцы, як вы ўжо ведаеце з тэзісаў, мяркуецца: а) рост продукцыі дзяржаўнае цэнзавае прамысловасьці на 319 проц.; б) рост рабочых

на 50 тыс. чалавек; в) рост продукцыйнасьці працы на 100 проц. па ўсёй прамысловасьці ВСНГ і ня менш, чымся на 50 проц. рост зарплаты; г) перавод усіх прадпрыемстваў цэнзавой прамысловасьці на 7-мі гадзінны рабочы дзень; д) уклад 260 млн. руб. у дзяржаўную цэнзавую прамысловасьць.

*Найбольш буйныя і цяжкія задачы.* Што трэба ў асноўным, каб вырашыць гэтыя задачы, за якія зьвеньні трэба ўхапіцца? За зьвеньні продукцыйнасьці працы. Уладзімер Ільліч у 1919 г. пісаў: «Продукцыйнасьць працы—гэта, у выніку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу. Капіталізм утварыў продукцыйнасьць працы, нячуваную пры прыгоне. Капіталізм можа быць канчаткова пераможаны і будзе канчаткова пераможаны тым, што соцыялізм стварае новую, куды больш высокую продукцыйнасьць працы. Трэба ўсе сілы кінуць на рацыяналізацыю вытворчасьці, на барацьбу за якасьць працы, на барацьбу проці нядбальства, п'янства, прагулаў на прадпрыемствах, на барацьбу за ўсё тое, што дае высокую продукцыйнасьць працы для поўнае перамогі над капіталізмам».

### Сельская гаспадарка.

Засеўная плошча за год вырасла на 2,6 проц., прычым пад збожжавымі—на 0,5 проц., пад іль-

ном—на 14,5 проц. і пад бульбаю—на 6,7 проц. Пры гэтым трэба адзначыць, што паказьнік росту засеўных плошчаў за мінулыя некалькі год вышэй даваеннага.

Наогул ў параўнаньні з 1913 г. мы маем рост засеўнае плошчы на 30 проц., рост рабочых коняй—на 20 проц. і буйнае рагатае жывёлы—на 6 проц.

У адносінах ураджайнасьці неабходна адзначыць вельмі нізкую яшчэ ўраджайнасьць, якая адстае па шэрагу асноўных культур ад даваеннага ўзроўню, асабліва па ільну-валакну і ільняному насеньню, абмінулі-ж даваенны ўзровень мы значна толькі па бульбе. Сярэдняя за 1924-27 г. у проц. да сярэдняга ўраджаю за 1909-1913 г. складае:

| | |
|---|---|
| Па жыту азімаму | 92,2 |
| „ ячменю | 99,2 |
| „ аўсу | 92,5 |
| „ бульбе | 123,9 |
| „ ільну-валакну | 73.2 |
| „ ільняному семю | 76,7 |

Таварнасьць сельскае гаспадаркі вельмі нізкая і характарызуецца наступнымі паказьнікамі па асобных галінах сельскае гаспадаркі для 1927-28 г.

| | |
|---|---|
| Расьлінаводзтва | 3,9 |
| У тым ліку збожжа | 2,2 |
| Тэхнічныя культ. | 24,6 |
| Жывёлагадоўля | 15,7 |

але таварная маса зямляробства ў 1927-28 г. вырасла (без унутры-сялянскага звароту) проці 26-27 г. у цэнах 26-27 г. на 4,9 проц. і ў цэнах адпаведнага году на 11,8 проц.

Гэтая нізкая таварнасьць адбілася на падзеньні прамысловасьці продукцыі, перапрацоўваючай

сельска-гаспадарчую сыравіну, маслабойнай—на 12,2 проц. ды ільна прадзільнай на 9,3 проц.

*Тлумачэньне нізкае таварнасьці ў першую чаргу, вельмі распыленай сялянскай гаспадарцы так, засеўная плошча ў 1927 г. вырасла ў параўнаньні з 1916 г. на 25,8 проц., колькасьць жывёлы—на 37,5 проц., а лік сялянскіх гаспадарак вырас за гэты тэрмін на 45,8 проц.*

Колгаснае будаўніцтва за апошні год значна ўзмацілася. Лік колгасаў з 440 дасяг 995, г. зн. рост на 126 проц., лік сем'яў вырас на 78 проц. і плошча пад колгасамі вырасла на 58 проц. Але і цяпер у процантных адносінах да ўсіх сялянскіх гаспадарак колгасы займаюць толькі 1 проц. Прычым належыць адзначыць тое, што нанава арганізаваныя колгасы малыя, у сярэднім плошча іх складае 65 гектараў. Адгэтуль таксама яшчэ нявысокая ўраджайнасьць і тое, што яны ня граюць яшчэ значнае агрыкультурнае ролі.

Саўгасы трохі ўмацаваліся. Асноўныя капіталы іх вырасьлі на 7,2 проц., цягавай сілай яны ўкомплектаваны на 100 проц., з мэханізацыяй яе на 12 проц. Агульная продукцыя іх складае 10 млн. руб. Вырасла трохі іх агрыкультурнае значэньне, але ў цэлым роля іх па ўсіх галінах сельскае гаспадаркі нязначная.

З галіны нашых мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы трэба тут коратка адзначыць: а) уклад у індустрыялізацыю сельскае гаспадаркі ў 1927-28 г.—1.600 тыс. руб. проці 560 тыс. руб. у 26-27 г.; б) зямляўпарадкаваньне на плошчы 630 тыс. гэктараў; в) асыгнаваньне на мэліорацыю ў сярэднім у апошнія гады за кошт дзяржбюджэту 750 тыс. руб. штогод; г) перасяленьню 25 тыс. душ за межы Беларусі; д) у вясеньнюю засеўную кампанію павялічана дастаўка насеньня на 88 проц.; е) законтрактавана больш 41 тыс. гектараў; ж) шматпольны зварот ахапляе 12 проц. усяе пашы і 10,8 проц. усіх гаспадарак, прычым плошча ворыва з шматпольлем дае ў гэтым годзе павялічэньне на 102,9 проц.; з) плян вытворчага крэдыту выкананы ў суме каля 18 млн. руб.; і) адносная вага загатовак аграмаджанага сэктару да ўсяе масы сельска-гаспадарчых продуктаў склала ў 1927-28 г.—28,7 проц. проці 24,8 проц. у 1926-27 г.

Зводныя агулы і задачы па сельскай гаспадарцы наступныя: у наяўнасьці рост і рэконструкцыя сельскае гаспадаркі, рост аграмаджанага сэктару, і розныя гутаркі аб «застоі», ці аб «дэградацыі» сельскае гаспадаркі зьяўляюцца ні чым іншым, як політычным ныцьцём, ці котррэволюцыйнай плёткай. Але як тэмп росту сельскае гаспадаркі, яго продукцыі, таварнасьці, так і рост аграмаджанага сэктару відавочна невыстарчальны. Тэмп росту прамысловасьці БССР, якая базіруецца ў значнай

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ступені на сельска-гаспадарчай сыравіне і ўлічвае шырокі сялянскі рынак, патрабуе *з усёй моцай фарсыраванага тэмпу ўздыму сельскае гаспадаркі*. Мы павінны ўжыць усе захады, каб дамагчыся ў самым бліжэйшым будучым рашучага ўздыму сельскае гаспадаркі, яе соцыялістычнае рэконструкцыі. *І асноўны вырашальны шлях, асабліва ва ўмовах Беларусі з дробнымі распыленымі сялянскімі гаспадаркамі, гэта шлях колектывізацыі, буйных колектываў*, пры адначасным усямерным стымуляваньні росту індывідуальнае бядняцка-серадняцкае сялянскае гаспадаркі. Патрэбна таксама ўмацаваць існуючыя саўгасы і пашырыць саўгаснае будаўніцтва. Барацьба за 7-мі проц. павышэньне ўраджайнасьці сёлета—наша баявая задача. Уся наша работа на вёсцы павінна праводзіцца выразна пад лёзунгам партыі—апоры на беднату, трывалага саюзу з серадняком і барацьбы з кулаком. Усе апараты павінны выразна праводзіць у жыцьцё гэтыя лёзунгі, пад асобным наглядам павінны знаходзіцца зямельныя і фінансавыя органы і коопэрацыйныя організацыі.

Гэта лінія партыі цалкам адбілася ў запроектаваных контрольных лічбах народнае гаспадаркі на 1928-29 г. і ў адпаведных лімітах паданае на ваша зацьверджаньне пяцігодкі разьвіцьця народнае гаспадаркі. Я падам толькі некалькі паказьні-



ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

каў. Па ўраджайнасьці вызначаецца ў бягучым годзе рост на 7 проц., зямляўпарадкаваньне вызначана на плошчы 700 тыс. гектараў, новыя колгасы разгорнуць на плошчы ня менш 50 т. гэкт., у індустрыялізацыю сельскае гаспадаркі прызначана ўкласьці больш 6 млн. руб., дастаўкі сельска-гаспадарчых машын за проектавана ў 6 млн. руб. з завозам 155 трактараў, значнае павялічэньне агропэрсаналу, пабудова 10 агропунктаў, больш чым у два разы процi мiнулага году павялічыць дастаўку мінэральных угнаеньняў, правесьці контрактацыю на плошчы 72 тыс. гектараў. А па пяцігодцы, як вы ўжо ведаеце з тэзiсаў, вызначаецца: а) рост ураджайнасьці на 45 проц.; б) рост засеўнае плошчы на 15 проц.; в) закончыць зямляўпарадкаваньне; г) ня ўжываць больш сахі, а замяніць яе ня менш як 2 тысячамі трактараў; д) павялічыць рост продукцыі на 60 проц. і рост таварнасьці на 300 проц.; е) колгасамі і саўгасамі ахапіць ня менш чым 12 проц. усяе засеўнае плошчы.

Гэты плян сапраўднага ўздыму і соцыялістычнае рэконструкцыі сельскае гаспадаркі, але плян, патрабуючы вялізнае ўвагі і сіл усяе партыі, рабочае клясы і працоўнага сялянства.

## Рост соцыялістычнага сэктару.

Мінулы год быў годам рашучага наступленьня на прыватна-капіталістычныя элемэнты, годам знач-

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

нага росту соцыялістычнага сэктару. Вось ящчэ некалькі асноўных лічбаў:

*1. Аграмаджаны сэктар у прамысловасьці (адносная вага).*

| | 1925-26 г. | 1926-27 г. | 1927-28 г. |
|---|---|---|---|
| Асноўныя фонды . . . . . | 75,4 | 79,3 | 84,3 |
| Агуловая продукцыя. . . . | 68,5 | 70,0 | 78,5 |
| Буйная . . . . . . . | 96,7 | 98,5 | 99,6 |
| Дробная . . . . . . | 23,4 | 29,8 | 35,2 |

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Аграмаджаны сэктар у прамысловасьці даў рост на 31,2 проц., прыватны сэктар на 21,5 проц.

*2. Аграмаджаны сэктар у тавараз вароце.*

Адносная вага прыватніка ў гурце зьнізілася з 7 проц. у 1925-26 г. да 1,7 проц. у 1927-28 г.; у раздробе прыватнік меў: у 1925-26 г.—46,3 проц., у 1926-27 г.—39,3 проц. і ў 1927-28 г.—29,6 проц. Спажывецкая коопэрацыя вырасла ў горадзе на 42,5 проц. пайнікаў і ахапіла 80 проц. усіх членаў профсаюзаў і па вёсцы на 34,4 проц. пайнікаў і ахапіла 55 проц. усіх сялянскіх гаспадарак.

Што да росту аграмаджанага сэктару ў сельска[й]
гаспадарцы, дык гэта я ўжо зазначыў у разь[]
дзеле аб сельскай гаспадарцы.

**Аб агульных задачах гаспадарчага будаўніцтва.**

Зводныя агулы нашага гаспадарчага будаў[]ніцтва за мінулы пэрыод гавораць аб значны[м] росьце народнае гаспадаркі БССР, аб некаторы[х] якасных дасягненьнях у працы, аб узмацненьн[і] соцыялістычнага сэктару. Але побач з гэтым мы маем за мінулы пэрыод і шэраг труднасьцяй, аса[]бліва ў галіне таварадастаўкі. Гэтыя труднасьц[і] былі зьвязаны з агульнасаюзнымі труднасьцям[і] між іншым у галіне хлебазагатовак, а таксама вы[]значаліся і невыстарчальным тэмпам росту сель[]скае гаспадаркі БССР. Усе гэтыя труднасьці былі труднасьцямі вялікага магутнага росту як СССР, так і БССР. Партыя без ваганьняў, без ныцьця, перамагала і перамагае гэтыя труднасьці, імкну[]чыся ўсямерна іх зьменшыць. Асноўныя паказьнікі нашага пляну далейшага гаспадарчага будаў[]ніцтва як па контрольных лічбах на 1928-29 г., так і па пяцігодцы, вызначаюць далейшы высокі на[]пружны тэмп соцыялістычнага будаўніцтва БССР. Мы і далей павінны цьвёрда і няўхільна право[]дзіць лінію партыі: а) усямерна разьвіваць вытвор[]чыя сілы Рэспублікі; б) усё павялічваць адносную вагу прамысловасьці ў народнай гаспадарцы і ра[]шуча ўзмацніць тэмп уздыму сельскае гаспадаркі;



ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

в) весьці і далей рашучае наступленьне на прыватнакапіталістычныя элемэнты гораду і вёскі. На гэтым шляху ў нас яшчэ шмат труднасьцяй наперадзе, але мы ўсе іх пераможам, калі наша партыя будзе і далей выразна праводзіць Ленінскую лінію, змагацца проці ўхілаў, калі яшчэ і яшчэ бліжэй падыйдзе практычна да пытаньняў гаспадаркі і калі яшчэ шчыльней злучыцца з рабочымі і працоўным сялянствам. Уладзімер Ільліч у проекце абежнага ліста ад ЦК ЎсеКП(б) наконт крызісу з апалам у 1919 г. пісаў: «галоўная крыніца нашае краіны: сьвядомасьць і героізм рабочых, якім не маглі і ня могуць не дапамагаць, не рабіць падтрыманьня, працоўныя сяляне. Прычына нашых перамог: непасрэдны зварот нашае партыі і савецкае ўлады да працоўных мас з зазначэньнем на кожную чарговую труднасьць і чарговую задачу; здольнасьць растлумачыць масам, чаму трэба згуртаваць усе сілы то на адным, то на другім баку савецкае работы ў той ці іншы момант; здольнасьць ўзьняць энэргію, героізм, энтузіязм мас, згуртоўваючы рэволюцыйна напружныя сілы на важнейшай чарговай задачы». Трэба цяпер нам з усёй моцай узьняць на бліжэйшым этапе нашае работы ўсё большы энтузіязм і энэргію мас на гаспадарчае социялістычнае будаўніцтва і мы з перавышэньнем усіх вызначаных лімітаў рэалізуем нашу пяцігодку. Хто з вас памятае, як Горкі яскрава апісвае ў «Моих университетах» сваё па-

чуцьці ад свае работы ў якасьці грузчыка ў вольскай арцелі грузчыкаў: «Я таксама хапаў мяхі, цягаў, кідаў, зноў бег, і хапаў і здавалася мне, што і я сам і ўсё навокал мяне завярцелася ў бурных скоках, што гэтыя людзі могуць так страшэнна і шалёна працаваць, не шкадуючы сябе месяцы, гады, што яны могуць, ухапіўшыся за званіцы і мінарэты гораду, сьцягнуць яго з месца, куды захочуць. Здавалася, што такому напружаньню радасна разьюшанай сілы нішто ня можа процістаяць, яна здольна зрабіць цуды на зямлі, можа пакрыць у адну ноч ўсю зямлю прыгожымі палацамі і гарадамі, як аб гэтым гавораць «вещие сказкі». А гэтая шалёная праца, як тут апавядае Горкі, вялася над каманду гаспадара грузу: «Малойчыкі—вядзёрка стаўлю! Разбойнічкі—два ідзе! Рабі!» А цяпер у нас у савецкай краіне, у рабочай дзяржаве, якую мы хочам пакрыць у найбольш кароткі гістарычны тэрмін вялізарнымі заводамі, фабрыкамі і электрастанцыямі, узьняць сельскую гаспадарку на аграмадную вышыню на базе новае тэхнікі—нам патрэбна нячуваная яшчэ продукцыйнасьць працы, продукцыйнасьць, аснаваная на энтузыязьме і энэргіі працоўных мас, працуючых не на капіталістага і абшарніка, а на сябе, на пролетарскую рэволюцыю, для перамогі соцыялізму ў нашай краіне і ва ўсім сьвеце.

У нумары «Маладняка», прысьвечаным 10-годзьдзю БССР, поэта Трус піша:

„Край лягенд адвечных, песен-казак,
Край поэм-бальзам жывых крыніц,
Край балот, тугі, азёраў наскіх.
Край цішы і громаў навальніц.
Край лясоў мінулых дзён паўстаньня,
Край нізін, прастораў дальніх шыр,
Край палёў, о, край, калі-ж ты станеш
Краем фабрык дымных і машын?!“

І марыць далей ён потым:

„Буду слухаць песьні Асінастрою,
Захаплюся музыкай турбін“.

Мне думаецца, што гэты тон сугучны настроям усяго партыйнага зьезду, усёй КП(б)Б і ўсіх працоўных мас БССР. За гады савецкае ўлады моцна расла прамысловасьць БССР, праз год запяе Асінастрой, запрацуе гэтай вясной магутны Бабруйскі комбінат, а там Аршанскі і Магілеўскі і г. д. Растуць колгасы, саўгасы. Расьце Савецкая Беларусь, Рэспубліка—фабрык і заводаў, магутнае сельскае гаспадаркі, колгасаў і саўгасаў. Расьце і будзе расьці, будаваная рукамі рабочых і сялян, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі ў шчыльнейшым і братэрскім саюзе з усім СССР.

## II. АБ КУЛЬТУРНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

Другім разьдзелам свайго дакладу я стаўлю разьдзел аб культурнай рэволюцыі, бо гэта пытаньне найшчыльней зьвязана з пытаньнем аб гаспадарчым будаўніцтве. Абодва яны знаходзяцца



С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке